Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 САКАВІКА 2008 г. СЕРАДА

№ 52 (26165)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.



## ЗАЎТРАШНІ НУМАР — УЖО СЁННЯ

Многія матэрыялы заўтрашняга нумара газеты чытачы «Звязды», якія зойдуць на наш сайт у Інтэрнэце (zviazda.by), змогуць прачытаць ужо сёння. Адпаведны сэрвіс распачаў работу з аўторка, 18 сакавіка. У хуткім часе рубрыка набудзе пастаяннае годнае месца і адпаведнае афармленне на галоўнай старонцы Інтэрнэт-версіі. Таксама ў бліжэйшы час «Звязда» прапануе наведвальнікам сайта газеты рубрыку «Навіны дня», дзе ўся апошняя інфармацыя будзе размяшчацца ў рэжыме on-line.

**Рэдакцыя.**

## Аляксандр Лукашэнка патрабуе дабіцца пералому ў барацьбе з аргзлачыннасцю і карупцыяй

**У Беларусі спакойная сітуацыя, людзі жывуць камфортна, заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытанні ўмацавання абараназдольнасці, правапарадку і бяспекі дзяржавы.**

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што сэнс нарады ў такім пашыраным складзе менавіта ў тым, каб «захаваць гэты спакой і бяспеку для нашых людзей».

Толькі ад зладжанай, эфектыўнай работы ўрада, дзяржаўных органаў і сілавых структур, хуткай іх адаптацыі да новых рэалій залежыць, ці зможам мы забяспечыць умовы для інтэнсіўнага развіцця эканомікі, сацыяльнай сферы, умацаваць абараназдольнасць і праваахоўны блок, надзейна гарантаваць бяспеку і спакойнае жыццё нашых грамадзян, зрабіць Беларусь па-сапраўднаму моцнай і квітнеючай, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь павінна быць гатова да павышэння напружанасці ў свеце, заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка.

«У бліжэйшы час мы можам апынуцца ў новай, больш напружанай сітуацыі ў свеце і вакол Беларусі, што патрабуе адэкватнага рэагавання з улікам нашых нацыянальных інтарэсаў і бяспекі нашай дзяржавы і нашага народа», — сказаў беларускі лідар.

«Фактычна вырашана пытанне аб размяшчэнні паблізу нашых граніц элементаў амерыканскай сістэмы ПРА, што падрывае стратэгічную стабільнасць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што нядаўна Расія, адчуўшы нарастанне знешняй пагрозы, прыбліжэнне рэальнай небяспекі да сваіх граніц, афіцыйна прыпыніла ўдзел у Дагаворы аб звычайных узброеных сілах у Еўропе. Неадназначная сітуацыя, паводле яго слоў, складваецца вакол Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што прэцэдэнт з абвяшчэннем незалежнасці Косава яскрава прадэманстраваў двайныя стандарты многіх дзяржаў. Паводле яго слоў, з'явілася новая цалкам рэальная пагроза аднабаковага перагляду граніц, перадзелу палітычнай карты Еўропы. «Небяспека сепаратызму сёння як ніколі актуальная для многіх краін. Як мы ведаем па нядаўніх падзеях, узнікла фактычна яшчэ адна гарачая кропка на карце планеты. Сёння ў Косаве фактычна ідуць баі. Усё гэта вядзе да змянення сучаснай архітэктуры еўрапейскай бяспекі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка патрабуе дабіцца пералому ў барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, карупцыяй, эканамічнымі злачынствамі.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, даклады і справаздачы аб аператыўнай абстаноўцы, якая складваецца, не адлюстроўваюць рэальнай сітуацыі. «Высокі ўзровень якасці работы ўсёй сілавой праваахоўнай сістэмы з'яўляецца абавязковай умовай забеспячэння канстытуцыйных гарантый грамадзян Беларусі. Закон і парадак заўсёды былі і застануцца асновай існавання любой дзяржавы. Гэта і ёсць нашы арыенціры. Аднак я з трывогай заўважаю, што ў забеспячэнні грамадскай бяспекі так і не ўдалося вырашыць галоўную задачу — пераадолець небяспечныя тэндэнцыі ў развіцці крымінагеннай абстаноўкі і дасягнуць адчувальных вынікаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб гучных крымінальных справах гомельскіх бандыцкіх фарміраванняў «марозаўцаў» і «пажарнікаў». «Малайцы, што выявілі гэта, пакаралі. Але важны іншы бок справы. Як магло здарыцца, што яны беспакарана бясчынствавалі амаль 10 гадоў на вачах міліцыі, пракуратуры і КДБ? Гэтыя факты сведчаць аб значных правалах і праблемах, якія глыбока ўкараніліся ўнутры нашых ведамстваў», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка прывёў статыстычныя даныя, згодна з якімі ў рэспубліцы, пачынаючы з 2001 года, пагаршаецца крымінагенная абстаноўка. Так, за апошнія 6 гадоў узровень злачыннасці ў разліку на 100 тыс. насельніцтва вырас на 70 працэнтаў, колькасць пацярпелых у выніку ўчынення злачынстваў павялічылася больш як у два разы, колькасць загінулых і параненых у крымінальных здарэннях перасягнула 40 тыс. чалавек. За гэты перыяд рэцыдыўная злачыннасць павялічылася ў 2,3 раза, у быце — амаль у 3,5 раза, злачынствы, учыненыя ў стане алкагольнага ап'янення, — у 2,3 раза, сярод непаўналетніх — на 30 працэнтаў.

Прэзідэнт звярнуў увагу таксама на зніжэнне ўзроўню абароненасці пажылых людзей і непаўналетніх. Паводле яго слоў, захоўваецца высокі ўзровень аварыйнасці і гібелі людзей на дарогах, зніжаецца актыўнасць процідзеяння незаконнаму абароту наркотыкаў. Колькасць афіцыйна зарэгістраваных наркаманаў кожны год павялічваецца ў сярэднім на 800 чалавек, на ўліку ва ўстановах Міністэрства аховы здароўя сёння знаходзяцца 10,5 тыс. наркаманаў. У той жа час, адзначыў кіраўнік дзяржавы, колькасць выяўляемых злачынстваў у сферы незаконнага абароту наркотыкаў пастаянна зніжаецца. У 2005 годзе — больш як на 9 працэнтаў, у 2006 годзе — на 9 працэнтаў, у 2007 годзе — амаль на 14 працэнтаў. «Гэта значыць, што наркаманаў кожны год больш, а выяўляецца злачынстваў у гэтай сферы ўсё менш. Прытым наркотыкі ў большасці сваёй пачалі цячы да наркаманаў праз Міністэрства аховы здароўя і яго работнікаў з гэтай сферы. І многія факты праваахоўным органам вядомыя, калі не ўсе», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў пагаршэнне якасці следства, пракурорскага нагляду, захаванне парушэнняў законнасці пры прыцягненні грамадзян да крымінальнай адказнасці. Напрыклад, у 2007 годзе былі незаконна прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 226 чалавек. У той жа час зніжаецца раскрывальнасць па ўсіх відах злачынстваў. У 2007 годзе нераскрытымі засталіся палавіна злачынстваў па краіне, у тым ліку 52 працэнты ў Мінскай вобласці, 65 працэнтаў — у Мінску. «Ну, а дзе прынцып непазбежнасці пакарання?» — задаў рэзоннае пытанне Прэзідэнт.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначае наяўнасць нявырашаных праблем у пытаннях боегатоўнасці Узброеных Сілаў, забеспячэння належных умоў захоўвання ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі, арганізацыі кадравай і выхаваўчай работы ў арміі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з году ў год зніжаецца ўкамплектаванасць войскаў афіцэрскім складам, па-ранейшаму не добраўпарадкаваны ваенныя гарадкі, не ўсё добра са сховішчамі для тэхнікі і боепрыпасаў, невысокай застаецца якасць падрыхтоўкі каманднага складу ўсіх узроўняў. «І што найбольш мяне непакоіць: афіцэрскі корпус менш гаворыць аб абараназдольнасці нашай дзяржавы і гатоўнасці абараняць краіну, а ўсё больш — аб тылавых пытаннях. Такіх афіцэраў я, як мінімум, не разумею, — сказаў Прэзідэнт. — Пацвярджаю, што кожны павінен жыць нармальна, і мы нямала апошнім часам для гэтага зрабілі. Але ні ў аднаго афіцэра гэта не павінна быць на першым плане». Кіраўнік дадаў, што Узброеныя Сілы Беларусі былі і застаюцца гарантам ваеннай бяспекі.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## Харчаванне школьнікаў — пад электронны кантроль!

**Пластыкавыя карткі для разлікаў за харчаванне плануюць у недалёкай будучыні ўкараніць ва ўсіх сталічных навучальных установах. Такі своеасаблівы «электронны кашалёк» дазволіць бацькам ажыццяўляць штодзённы маніторынг харчавання іх дзяцей у школе.**

Спецыялісты аддзела гігіены дзяцей і падлеткаў Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі адзначаюць, што ў большасці сталічных агульнаадукацыйных установаў належныя ўмовы для атрымання паўнавартаснага гарачага харчавання: на харчовых блоках ёсць адпаведнае абсталяванне, пастаянна ўдасканальваецца сістэма абслугоўвання дзяцей, апошнім прадастаўляецца магчымасць папярэдняга выбару і заказу гарачых страў (меню сёння на заўтра) або асобных комплексаў сняданкаў і абедаў. Дадаткова ў буфетах рэалізуецца малочная, кісламалочная прадукцыя, салаты з агародніны, булачныя вырабы і іншая прадукцыя.

Але чаму аддаюць перавагу сталічныя школьнікі? Асартымент іх схільнасцяў даволі стандартны: дзеці з вялікай ахвотай выбіраюць булачкі, піцу, сасіскі, жэле і іншыя ласункі. Прасцей кажучы, зусім не «здаровае харчаванне»...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08052




**— Сёлетні зімовы клімат не спрыяў здароваму самаадчуванню пчалы,— заклапочана кажа пры сустрэчы глыбоцкі пчаляр і наш даўні чытач Анатоль Лявонавіч СКРАБАТУН. — Дзякуй Богу, вясна на парозе, болей сонейка!**

**Хоць з кастрычніка па красавік у мядовай гаспадарцы «ціхі час», кола клопатаў гаспадара ніколькі не меншае, чым у іншую пару: рэстаўрацыя старых домікаў, рамонт і навашчванне рамак, збор воску, выраб новых пастак. І, вядома ж, азнаямленне з навінкамі друку. Кнігамі, часопісамі і газетамі з парадамі аматарам пчалярскіх спраў у Анатоля Лявонавіча завалены ўвесь стол у яго спецыяльным доме-амшаніку, за якім утульна і маляўніча стаяць вуллі. І хоць нетыповая зіма ўжо ззаду, жыхар вёскі Рускі Завулак не губляе пільнасці і нават па гуку адсочвае «паводзіны» насельнікаў кожнай хаткі — каб быць у курсе ўсіх пчаліных спраў. Каб з мёдам быць заўсёды. Інтуіцыя, багаты досвед і руплівая праца яшчэ ніколі не падвялі яго. Нездарма кажуць: «У добрага пчаляра не бывае дрэннага мёду».**

**А каб быць у курсе спраў жыццёвых, у дом пчаляра болей за дзесяць гадоў прыходзіць «Звязда». З цікавасцю чытаюць яе ўсе хатнія: жонка Уладзіслава Вікенцьеўна, сын Валерый і нявестка Зоя. Сын працуе лесніком Поразаўскага лясніцтва, нявестка — настаўніца матэматыкі базавай школы ў суседняй вёсцы Івесь.**

**«Гэта дзякуючы Зоі газета «Звязда» стала нашай добрай сяброўкай», — за кубачкам гарачага чаю (зразумела, з мёдам) не забывае падкрэсліць дбайны вясковы гаспадар-пчаляр.**

***НА ЗДЫМКУ: гэтую скрыню-пастку для пчаліных раёў, якія вылецелі, Анатоль Скрабатун размесціць на дрэве ці ў лесе, ці ў зарасніках побач з сядзібай.***



## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

**Працягваецца падпіска на ІІ квартал 2008 года.**
**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8800 | 26400 | 52800 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8300 | 24900 | 49800 |
| 63858 (ведамасны) | 14000 | 42000 | 84000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 12800 | 38400 | 76800 |



### АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ХУ ЦЗІНЬТАО З ПЕРАВЫБРАННЕМ НА ПАСАДУ СТАРШЫНІ КНР

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Ху Цзіньтао з нагоды перавыбрання на пасаду старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ўсямернае выкарыстанне існуючага патэнцыялу супрацоўніцтва дасць магчымасць адносінам паміж Беларуссю і Кітаем выйсці на якасна новы ўзровень і далей умацоўвацца на карысць двух народаў.

### ЗДАРОВАЯ МОЛАДЗЬ — ЗАЛОГ ДАБРАБЫТУ БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт Беларусі, Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам рэспубліканскіх спаборніцтваў «Залатая шайба».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў сімвалічнасць таго, што гэта дзіцячае свята праводзіцца ў Беларусі ў год, абвешчаны Годам здароўя. «Прадаўжаючы выдатныя традыцыі дзіцячага хакея, такія спаборніцтвы прызначаны гадаваць не толькі чэмпіёнаў, але, самае галоўнае, здаровую моладзь — залог дабрабыту Беларусі ў будучым», — гаворыцца ў пасланні. Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што гэты спартыўны рух будзе яшчэ больш масавым і паслужыць справе прапаганды фізічнай культуры і актыўнага ладу жыцця.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Іншагароднім студэнтам і навучэнцам дзяржустаноў будзе аказана матдапамога на праезд

**Матэрыяльная дапамога на праезд будзе аказана іншагароднім навучэнцам і студэнтам дзяржустаноў дзённай формы навучання, сярэднедушавы даход сям'і якіх не перасягае 100 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага ўрадам Рэспублікі Беларусь, за два апошнія кварталы. Такая норма змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 375 «Аб парадку аказання матэрыяльнай дапамогі на праезд маючым патрэбу навучэнцам і студэнтам дзяржаўных устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі».**

У дакуменце, у прыватнасці, гаворыцца, што матэрыяльная дапамога навучэнцам і студэнтам будзе аказана ў выглядзе частковай кампенсацыі (у памеры, які не перасягае 50 працэнтаў) кошту праезду (праязнога дакумента) да месца пражывання сям'і (бацькоў) не больш як за дзве паездкі (туды і назад) у месяц на пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносінаў або не больш як за чатыры паездкі (туды і назад) у месяц на пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносінаў.

Матэрыяльная дапамога аказваецца навучэнцам і студэнтам на праезд у суботнія, нядзельныя і святочныя дні, устаноўленыя і аб'яўленыя кіраўніком дзяржавы нерабочымі, а таксама ва ўсе дні тыдня ў час зімовых канікулаў на перыяд з 1 кастрычніка па 30 чэрвеня, але не раней як з дня падачы заявы з усімі неабходнымі дакументамі. Рашэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі на праезд канкрэтнаму чалавеку і яе памеры прымаецца пастаянна дзеючай камісіяй па аказанні матэрыяльнай дапамогі на праезд. Камісія ствараецца ва ўстанове адукацыі. На падставе рашэння гэтай камісіі выдаецца загад кіраўніка адукацыйнай установы аб аказанні матэрыяльнай дапамогі на праезд навучэнцам і студэнтам, у загадзе называецца перыяд аказання дапамогі і яе памер.

Сярэднедушавы даход сям'і навучэнца ці студэнта вылічваецца за тры месяцы, якія папярэднічалі месяцу звароту па назначэнне матэрыяльнай дапамогі на праезд. Для сям'і сярэднедушавы даход вызначаецца шляхам дзялення сукупнага даходу ўсіх членаў сям'і за разліковы перыяд на колькасць месяцаў у гэтым перыядзе і на колькасць членаў сям'і, улічаных у яе складзе. Пастанова ўступае ў сілу праз 10 дзён з моманту яе афіцыйнага апублікавання.

**БЕЛТА.**

### ЗАТРЫМАНА БУЙНАЯ ПАРТЫЯ «ГАРУЧАГА»

**5530 літраў спіртазмяшчальнай вадкасці на агульную суму 55 мільёнаў 300 тысяч рублёў канфіскавана ў доме 49-гадовага сталічнага жыхара ў вёсцы Навасёлкі Мінскага раёна.**

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, «гаручае» захоўвалася ў пяцілітровых каністрах без этыкетак. Адказ на пытанне, што гэта за змесціва, павінна даць экспертыза.

Аднак ужо цяпер, упэўненыя ў праваахоўных органах, можна сцвярджаць, што выяўленая вадкасць адносіцца да класа такіх «напояў», як «Максімка», «Кіруша» і т.п. Паводле папярэдняй інфармацыі, канфіскаваны прадукт быў дастаўлены ў нашу краіну з Расіі: вадкасць меркавалася збываць дробнымі партыямі на тэрыторыі Мінска і Мінскага раёна. Цяпер супрацоўнікі міліцыі ўстанаўліваюць кола асобаў, што маюць дачыненне да канфіскаванай спіртазмяшчальнай вадкасці.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Кампетэнтна

## АТАМНАЯ БУДУЧЫНЯ БЕЛАРУСІ БУДЗЕ БЯСПЕЧНАЙ



**У свядомасці беларусаў словазлучэнні «атамная электрастанцыя», «мірны атам» маюць ярка выражаную адмоўную афарбоўку. Гэта не дзіўна: яны аўтаматычна выцягваюць з памяці ўспаміны аб чарнобыльскай трагедыі, рэха якой будзе гучаць над Беларуссю яшчэ многія гады. Жыццё асобных людзей і цэлай краіны падзялілася на два перыяды — «да Чарнобыля» і «пасля Чарнобыля». У псіхалогіі з'явіўся новы тэрмін — «чарнобыльскі сіндром».**

**Нягледзячы на шок, які выклікала ў свеце чарнобыльская катастрофа, астатнія краіны не адмовіліся ад выкарыстання таннай атамнай электраэнергіі. Сёння АЭС ёсць у ЗША, Францыі, Канадзе, Кітаі, Расіі, Фінляндыі, Чэхіі, Украіне і шмат дзе яшчэ. Аб'ектыўныя геапалітычныя і эканамічныя прычыны абумовілі неабходнасць будаўніцтва сваёй атамнай электрастанцыі і ў нас. Адпаведнае рашэнне было прынята на самым высокім узроўні. І выклікала многа спрэчак і хваляванняў. Праціўнікі будаўніцтва беларускай АЭС прыводзяць розныя доказы «супраць», аднак мала хто з іх ведае, што яшчэ ў савецкі час на тэрыторыі БССР планавалася ўзвядзенне дзвюх атамных станцый...**

— У складзе Савецкага Саюза Беларусь была адной з найбольш індустрыяльна развітых, — расказвае **намеснік акадэміка-сакратара аддзялення фізіка-тэхнічных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр МІХАЛЕВІЧ**. — Калі мы ўзгадаем апошнія 15 гадоў існавання СССР (з 1975 па 1990), то ўбачым, што спажыванне электраэнергіі на душу насельніцтва за гэты перыяд у БССР узрасло на такую ж велічыню, як і ў цэлым па Саюзе, і ў ЗША (а індэкс энергаспажывання на душу насельніцтва — гэта адзін з асноўных паказчыкаў эканамічнага развіцця). Назіралася цікавая сітуацыя: рост спажывання электраэнергіі ў БССР быў на ўзроўні дзвюх супердзяржаў, а прырост магутнасцяў уласных электрастанцый — у 5 разоў меншы, чым у Саюзе, і ў 6 — чым у Злучаных Штатах Амерыкі. Уся эканоміка Савецкай Беларусі была фактычна зарыентавана на атамную энергетыку, і прырост энергетычных магутнасцяў ёй забяспечвалі атамныя электрастанцыі, пабудаваныя на тэрыторыі суседніх рэспублік недалёка ад агульнай мяжы. Так, Ігналінская станцыя геаграфічна знаходзіцца за 12 км ад Беларусі, Чарнобыльская — за 14 км, Смаленская — за 50, Ровенская — за 60 км. Для сучасных ліній электраперадач гэта не адлегласці. Калі ў апошнія гады існавання Саюза агульная магутнасць усіх беларускіх электрастанцый складала прыкладна 6 млн кВт, то магутнасць акаляючых яе атамных электрастанцый — 12 млн кВт. Усе яны трэць сваёй выпрацаванай энергіі аддавалі на Беларусь.

***— Тым не менш, у БССР вяліся работы па будаўніцтве сваёй АЭС?..***

— Яны распачаліся ў 1983 годзе пад Рудзенскам, за 40 км ад сталіцы. Мінская атамная цеплаэлектрацэнтраль павінна была стаць першай у свеце атамнай станцыяй, якая забяспечвала б спажыўцоў не толькі электрычнай, а яшчэ і цеплавой энергіяй. Паралельна рыхтаваліся дакументы на праектаванне яшчэ адной станцыі — Беларускай АЭС, недалёка ад Лукомля. Чарнобыльская катастрофа змяшала ўсе планы. Будаўніцтва Мінскай АЦЭЦ было спынена. Адзначу, што на момант аварыі грошы, адведзеныя пад новую атамную станцыю, былі асвоены напалову (там ужо з'явіліся дарогі, камунікацыі, жылы пасёлак, катлаван пад фундамент). Сёння гэта Мінская ЦЭЦ-5.

**(Заканчэнне на 6-й стар.)**

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.03.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 146,00 |
| 1 еўра | 3 385,96 |
| 1 латвійскі лат | 4 857,95 |
| 1 літоўскі літ | 980,67 |
| 1 чэшская крона | 134,67 |
| 1 польскі злоты | 955,84 |
| 1 расійскі рубель | 91,19 |
| 1 украінская грыўня | 428,17 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў* **Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 23,5325 |
| 10 UAH | 46,2328 |
| 1000 BYR | 10,9564 |
| EUR | 37,0825 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 18.03.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЁН ПРАГЛЫНУЎ ПАКЕТ З ГЕРАІНАМ І ХАЦЕЎ «З'ЕСЦІ» ГРОШЫ

**Супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці ў ходзе аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў выйшлі на 35-гадовую жыхарку Светлагорска, якая раней зведала лаву падсудных за продаж наркотыкаў, але не зрабіла з гэтага правільных высноў і працягвала іх рэалізоўваць моладзі горада і раёна. Яна вымушана была прызнацца, што атрымлівае іх у братоў-цыганоў, якія рэалізоўвалі гераін праз наркапункты, а таксама наладзілі яго збыт і ў сваёй вёсцы.**

Калі прыйшла чарга затрымаць іх, старэйшы брат праглынуў пакет з наркотыкам і паспрабаваў «з'есці» дзве купюры па сто тысяч рублёў кожная, але яму перашкодзілі, выцягнуўшы грошы з рота. Наркотыкі ж «убачылі свет», калі ў ізалятары часовага ўтрымання зламысніку прамылі страўнік. Як было потым устаноўлена, браты «справу» сваю вялі на шырокай ніве, аб чым сведчыць тое, што ў іх кватэры былі выяўлены пры вобыску шпрыцы, запоўненыя наркатычнымі сродкамі, і матэрыял, падрыхтаваны для расфасоўкі гераіну, а таксама буйная сума грошай, сабраных братамі з пунктаў рэалізацыі наркотыкаў.

У дачыненні да гэтых трох асобаў узбуджаны крымінальныя справы, і цяпер устанаўліваецца канал паступлення гераіну ў рэгіён, а таксама іншыя ўдзельнікі наркабізнэсу. Упраўленне КДБ па Гомельскай вобласці просіць грамадзян, якім штосьці вядома аб учыненні гэтага злачынства, і іншых, якія ўваходзяць у кампетэнцыю органаў дзяржаўнай бяспекі, пазваніць па «тэлефонах даверу»: у Гомелі 79 23 31 і 219 92 99 у Мінску. А між тым, у Гомелі ў адным з судоў разглядаецца крымінальная справа ў дачыненні да арганізаванай злачыннай групы ў складзе дзевяці чалавек, якія займаліся збытам наркотыкаў. Яе выявілі супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі УУС аблвыканкама і аналагічных падраздзяленняў аддзелаў унутраных спраў Цэнтральнага раёна Гомеля і Веткаўскага РАУС. Абвінавачваныя жылі ў розных кутках вобласці, а гераін распаўсюджвалі ў Гомелі, Жлобіне, Ветцы і Светлагорску.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### «DUTY FREE» ДОМА...

**У Мінску змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання непрацуючы расійскі грамадзянін, які ў беларускай сталіцы з размахам наладзіў незаконны гандаль алкагольнай і тытунёвай прадукцыяй.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, хадавы тавар, які прызначаны для рэалізацыі ў сетцы бяспошліннага гандлю «Duty Free», расіянін, які мае пасведчанне на права жыхарства ў нашай краіне, прадаваў ва ўласнай кватэры. Прычым займаўся даходным бізнэсам ён без дзяржаўнай рэгістрацыі на тэрыторыі сталіцы. Набываючы алкагольную і тытунёвую прадукцыю оптам, прайдзісвет потым рэалізоўваў яе людзям у розніцу. Між іншым, паводле папярэдняй інфармацыі, атрыманы такім чынам падазроным незаконны даход склаў больш за 12 мільёнаў рублёў. Па месцы жыхарства затрыманага знойдзена і канфіскавана 313 бутэлек алкагольнай прадукцыі — віскі, каньяк, гарэлка, лікёр — і тытунёвыя вырабы на агульную суму каля 33 мільёнаў рублёў. Учора аддзелам папярэдняга расследавання Упраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Беларусі ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да прадпрымальнага расіяніна.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### БУДЗЕ ПАЛЯВАННЕ!

У адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, з 20 сакавіка ў краіне пачынаецца веснавое паляванне на глушца і цецерука на таках па разавых дазволах на здабычу гэтых відаў. З 5 красавіка будзе дазволена здабыча качароў дзікіх качак з засады з падсаднымі качкамі, чучаламі ці вабікамі і на вальдшнэпа на цязе. Нагадаем таксама, што па 11 мая будзе дазволена веснавое паляванне з засады, з падыходу на пералётных гусей.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,**
**расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,**

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 25 МАРТА 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении Дополнения 1 к Положению о службе ревизий.
3. Об утверждении Дополнения 1 к Положению о порядке начисления и выплаты дивидендов по акциям ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 22 марта), а также с решениями, принятыми внеочередным общим собранием акционеров банка (после 25 марта) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней — до 22 марта 2008 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 04.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

**Комитет по труду, занятости и социальной защите Мингорисполкома**

**24 МАРТА 2008 г. с 11.00 до 15.00**
**во Дворце культуры и спорта железнодорожников (г. Минск, ул. Чкалова, 7)**
**проводит**
**ЯРМАРКУ ВАКАНСИЙ**
**предприятий строительной и промышленной отраслей.**

**ОСНОВНЫЕ ЦЕЛИ МЕРОПРИЯТИЯ:**
- трудоустройство граждан Республики Беларусь на строительные и промышленные предприятия г. Минска;
- содействие предприятиям, организациям в подборе кадров.

**В ПРОГРАММЕ ЯРМАРКИ:**
- встречи с представителями более 100 предприятий и организаций, осуществляющих прием работников;
- консультации по законодательству о занятости, об услугах, возможностях профессионального обучения безработных при содействии службы занятости.

**ПРОЕЗД:**
автобусы №№ 10, 40, 45, 47, 53, 73, 82, 100,
троллейбусы №№ 11, 19, 27, 43, 51, 59
до остановки «Гостиница «Спутник».

**Телефон для справок: (8 017) 267 03 49**

УНП 100557355

**Минский городской центр недвижимости проводит аукционы по продаже:**

гаража в кооперативе «Восток-1» по ул. Калиновского, 119 (53,1 кв. м);
гаража в гаражном массиве «Северный» по ул. Ангарская, 100 (20,6 кв. м.);
пятикомнатной квартиры по проспекту Независимости, 76а в г. Минске (153,5 кв. м);
двухкомнатной квартиры по проспекту Машерова, 76 в г. Минске (46,9 кв. м).

**Телефоны: (017) 227 48 36, 227 40 22.**

УНП 190398583

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

19 сакавіка 2008 г.
№ 11 (114)

ДЗЕНЬ ДЭПУТАТА

**Напярэдадні першага веснавога суботніка Мінскі раённы Савет правёў у Заслаўі Дзень дэпутата, асноўнай тэмай якога была вызначана актывізацыя дзейнасці дэпутацкага корпуса сельскіх Саветаў у вырашэнні агульнай задачы — навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні населеных пунктаў.**

# НА ПАРАДКУ ДНЯ — ПАРАДАК

У азначаным мерапрыемстве, акрамя старшынь сельвыканкамаў, актыву дэпутацкага корпуса пярвічнага, базавага ўзроўню і прадстаўнікоў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, узялі ўдзел старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана Герасімовіч, абласныя дэпутаты, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Фёдар Стрыкаў.

**Святлана ГЕРАСІМОВІЧ:**

— Вы ўсе добра разумееце, што да Мінскай вобласці прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні па ўсіх паказчыках, і ў першую чаргу — па добраўпарадкаванні. Наша задача — дайсці да кожнай вёскі, да кожнага двара, да кожнага жыхара, каб ачысціць населеныя пункты ад ламачча і смецця, прывесці вуліцы ў парадак. Асаблівую ўвагу звярніце на пустыя старыя дамы. Шукайце спадчыннікаў. Сёння ў Мінскім раёне яшчэ застаюцца праблемы з забяспечанасцю асобных населеных пунктаў вадой. Іх трэба вырашаць. Гэта непарадак, калі 1,5 года людзям прывозяць ваду. Ёсць пытанні з вулічным асвятленнем. Не ўсе яшчэ перайшлі на энергазберагальныя свяцільнікі. Асобная тэма — дарогі. Згодна з Указам № 21 яны павінны быць перададзены на баланс спецыялізаваных арганізацый. Гэта складанае пытанне. Пакуль вуліцы не перададзены, паспрабуйце знайсці падтрымку ў кіраўнікоў мясцовых гаспадарак.

**Дэпутат Мінскага раённага Савета Сяргей АНДАЛЮКЕВІЧ:**

— Я з'яўляюся дырэктарам Мінскага завода «Уторчармет» і, натуральна, маю непасрэднае дачыненне да добраўпарадкавання тэрыторыі раёна. У гэтым накірунку мы плённа супрацоўнічаем са старшынямі сельвыканкамаў, ачышчаем палі, лясы, населеныя пункты ад старых аўтамабільных кузаваў і іншага металалому. Старшыні дастаткова патэлефанаваць мне, і ўжо на наступны дзень прыедзе наша спецтэхніка, а праз тыдзень на рахунак сельвыканкама паступаюць грошы за здадзены металічны лом. Ведаю, што за гэтыя сродкі сельвыканкамы набылі бензапілы, бензакосы, выпісалі прэміі тым жыхарам, чый двор быў прызнаны лепшым у плане добраўпарадкавання. Як бачым, навядзенне парадку можа стаць крыніцай папаўнення бюджэту сельвыканкама... Як дэпутат, я нядаўна сутыкнуўся з такой праблемай: да мяне звярнуліся жыхары вёскі Асееўка з просьбай дапамагчы ім спілаваць аварыйныя дрэвы. Аказалася, што ў Мінскім раёне няма спецыялізаванай службы. Я знайшоў прыватніка, які запрасіў за адно дрэва 600 тысяч. Натуральна, пенсіянеры такую суму «не пацягнуць».

**Старшыня Мінскага раённага Савета Алена МЕЛЯШКЕВІЧ:**

— Звяртайцеся ў Заслаўскую службу ЖКГ. Там устаноўлены дзяржаўныя расцэнкі, а работу спецыялісты выконваюць якасна і аператыўна. Для адзінокіх пенсіянераў, людзей сацыяльна неабароненых расходы па спілаванні аварыйнага дрэва бярэ на сябе сельвыканкам.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

# ЧАМУ АДХОДЫ НЕ ІДУЦЬ У ДАХОДЫ?

## На кожным кубаметры вывезенага смецця прысталічны КУП губляе 10 тысяч рублёў

**Здавалася б, камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы, створаныя ў межах прысталічнай зоны, павінны заўважна адрозніваецца ад тых, што ўзніклі, скажам, дзе-небудзь у глыбінцы. І па аб'ёмах бюджэту, і па пераліку паслуг, і па сферах дзейнасці, і па перспектывах развіцця. Але... Для мяне, напрыклад, сталі поўнай нечаканасцю разважанні Сяргея ЖОЛУДА, дырэктара камунальнага прадпрыемства «Экскампаслуга» Каладзішчанскага сельсавета Мінскага раёна. Сяргей Васільевіч выказаў думку, што нягледзячы на відавочную розніцу ў «вагавых катэгорыях», КУПы, створаныя на перыферыі (ці проста на тэрыторыі раёнаў, аддаленых ад Мінска), маюць больш магчымасцяў для пашырэння і развіцця паслуг насельніцтву, чым прысталічныя. Чаму?**

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



Дырэктар КУП «Экскампаслуга» Сяргей ЖОЛУД.

— Давайце я правязу вас па тэрыторыі сельсавета, — прапанаваў ён. — І патлумачу, чым даводзіцца займацца нашаму прадпрыемству.

Дваццаці хвілін, адведзеных на «экскурсію», цалкам дастаткова, каб зразумець: добраўпарадкаваннем тут сёння займаюцца дзве арганізацыі — вышэйназваныя КУП і ЖКГ Мінскага раёна. І за першай, і за другой замацаваны пэўныя тэрыторыі, якія па санітарным стане адрозніваюцца паміж сабой, як... неба і зямля. Прычым яўна не на карысць ЖКГ.



Тое, з чым даводзіцца працаваць.

— Смецце — наш агульны «біч», наша сапраўдная бяда, — тлумачыць Сяргей Жолуд. — Да 2004 года ў сельскай мясцовасці ім увогуле ніхто не займаўся — усё вывозілася ў лес. Сёння работнікі КУПа спрабуюць зламаць гэту сістэму, наладзіць новую, цывілізаваную. Жывём жа тут, працуем, дзеці нашы падрастаюць. Колькі можна на гэты бруд глядзець?

— І як «ламаецца сістэма»? Паспяхова?

— Не вельмі... На тэрыторыі сельсавета пражывае больш за 15 тысяч жыхароў, летам гэта лічба ўзрастае да 20—22 тысяч... Між тым, мы заключылі ўсяго 2 тысячы дагавораў на вываз бытавых адходаў. Што толькі ні рабілі — хадзілі па дварах, па дамах, тлумачылі, прасілі. Свядомыя людзі, безумоўна, знайшліся, тым больш што аплата за гэту нашу паслугу выходзіць смешная — 7 тысяч рублёў на год. Але іх было не шмат. Астатнія сказалі: а навошта нам плаціць? Смецце можна выкінуць на дарозе, у лесе, на аўтобусным прыпынку... Колькі разоў я сам гэта назіраў...

Дарэчы, на адной з сесій сельвыканкама Сяргей Жолуд прапанаваў прыняць рашэнне: браць у людзей аплату за вываз смецця адначасова з зямельным падаткам, хоць бы ў тых населеных пунктах, якія прылягаюць да сталіцы. Але большасць дэпутатаў запярэчылі: маўляў, а на якой падставе мы будзем гэта рабіць? Калі няма адпаведнага заканадаўчага акта на ўзроўні рэспублікі, усе іншыя рашэнні для людзей не ўказ.

— Магчыма, яны мелі рацыю. Сярод 15 тысяч жыхароў сельсавета заўсёды знойдзецца хоць бы адзін, які скажа, што гэта незаконна — прымушаць грамадзяніна заключаць дагавор, — гаворыць дырэктар КУПа. — Выходзіць парадокс: столькі людзей на нашай тэрыторыі будуюць сёння жыллё, уводзяць у эксплуатацыю катэджы — і ніхто не мае дагавораў на вываз смецця. Атрымліваецца, што апошняга... не існуе. Ну як можна пабудаваць дом без адходаў? А колькі іх, такіх, уводзіцца ў эксплуатацыю...



Трактарыст Дзмітрый АСТРОЎСКІ.

«Расхлёбвацца» з гэтымі самымі «адходамі» даводзіцца камунальнаму ўнітарнаму прадпрыемству. Хоць тэарэтычна вываз адходаў без заключэння адпаведнага дагавора з фізічнай або юрыдычнай асобай не ўваходзіць у абавязкі КУП «Экскампаслуга». Аднак калі Сяргей Жолуд «стане ў позу» і перастане займацца «дабрачынным» (іншага слова не падбярэш) вывазам адходаў, тэрыторыя за тыдзень-два проста загразне ў смецці.

— А ўсе шышкі паляцяць на старшыню сельвыканкама: чаму не прыбіраеце тэрыторыю?

КУП — прадпрыемства гасразліковае, яно павінна як мінімум акупляць усе свае расходы: на выплату зарплаты, падаткаў, рамонт тэхнікі, паліва і г.д. У ідэале заробленых грошай павінна быць столькі, каб заставалася і на развіццё прадпрыемства: на новы трактар, на матэрыяльнае заахвочванне работнікаў, на павышэнне зарплаты, на пашырэнне сферы паслуг...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

«КРУГЛЫЙ СТОЛ»

# ПРЕДПРИЯТИЙ — БОЛЬШЕ, А НАЛОГОВ — МЕНЬШЕ

**На днях в Институте высших управленческих кадров Академии управления при Президенте Республики Беларусь был проведен «круглый стол» с участием председателей сельских и поселковых Советов депутатов.**

Подобные встречи традиционно проходят в неформальной обстановке и предполагают в первую очередь живое, искреннее общение, обмен мнениями и опытом, обсуждение болевых точек. Именно такой тон задал мероприятию председатель Постоянной комиссии Совета Республики по экономике, бюджету и финансам, член Совета по взаимодействию органов местного самоуправления **Степан ПИСАРЕВИЧ**, предложив не делить аудиторию на выступающих и слушателей, а поучаствовать в разговоре всем.

Характеризуя социально-экономическое развитие республики, он подчеркнул, что в целом здесь наблюдается нормальная динамика, мы живем в приемлемых условиях в стабильном обществе. Даже с учетом инфляции зарплата в стране за два последних года выросла более чем на 31 процент (хотя ее средние показатели по селу значительно отстают от городских).

— Вместе с тем, существует ряд проблем, над которыми постоянно работает и законодательная власть, и правительство, и вы на местах, — сказал, обращаясь к аудитории, Степан Писаревич. — Так, основные фонды многих предприятий давно устарели. Несовременные станки, несовременные технологии — все это сдерживает наш рост. Кроме того, «больным» остается вопрос налогообложения — у нас налоговая нагрузка на предприятия более существенная, чем, например, в соседних странах. Хотя мы работаем в данном направлении и в целом уже уменьшили эту нагрузку на 1 триллион рублей.

Так как увеличивать налоги больше нельзя, необходимо искать иные источники пополнения бюджета. А для этого — создавать новые предприятия, осваивать новые производства. То есть, налоговая база должна стать больше, а сами налоги — меньше. Чтобы переориентировать местную власть **на зарабатывание денег на своих территориях**, и был разработан целый комплекс мер.

— Фактически в государстве уже создана нормативно-правовая база, которая позволяет Советам и исполнительным органам власти (начиная с областных и заканчивая первичными) предпринимать в этом направлении какие-то действия. Это должно стать для вас задачей номер один, — подчеркнул Степан Писаревич.

Много вопросов, касающихся реализации Указа Президента № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения», прозвучало в ходе работы «круглого стола» в адрес начальника отдела региональных бюджетов главного управления бюджетной политики Министерства финансов **Зои КРУГЛИКОВОЙ**. Подводя первые итоги работы по этому документу (указ был подписан в начале прошлого года), Зоя Николаевна отметила:

— Теперь каждый председатель сельисполкома имеет четкое представление об источниках формирования доходной части бюджета первичного уровня и расходных полномочиях. Сегодня все доходы являются закрепленными за этими бюджетами на постоянной основе, никто не имеет права какую-то часть у вас забрать.

При формировании бюджета на 2008 год повсеместно учтены нормы Указа № 21. Доходная часть первичных бюджетов пополнилась еще одним обязательным источником — отчислениями от местных налогов и сборов.

— Там, где этого не сделано, бюджеты сформированы неправильно, — подчеркнула Зоя Кругликова.

Тем не менее, уровень дотационности некоторых бюджетов первичного звена остается довольно высоким. Поэтому задача председателей сельских и поселковых Советов — изыскать дополнительные финансовые ресурсы на своей территории. Это может быть и сдача в аренду пустующих площадей, и создание производств, и оказание населению услуг.

— Если у вас на местах накопились задачи, связанные с дополнительными расходами, активизируйте для их выполнения возможности субъектов хозяйствования, расположенных на вашей территории. А также — население, которое тоже должно участвовать в решении каких-то мелких вопросов. Например, путем сбора добровольных взносов. Решение об этом принимается на общем собрании граждан. Добровольные взносы не имеют ничего общего с налогами или поборами. Они направляются (по решению собрания граждан) на реализацию тех или иных задач, не требующих больших затрат, — пояснила Зоя Кругликова.

Отвечая на вопрос о том, будут ли вноситься изменения в Указ № 21 (поскольку никто из представителей первичного звена власти не почувствовал, что на них обрушился «финансовый дождь»), Зоя Кругликова отметила:

— Как жизнь не стоит на месте, так и законодательная база претерпевает изменения, развивается. В частности, Национальным собранием нам уже поручено вместе с облисполкомами проработать вопрос и внести в Совмин свои предложения по поводу **зачисления в бюджеты первичного уровня части прибыли вновь созданных на ваших территориях предприятий.**

Важными доходными источниками — потому что условия в регионах для этого есть — Зоя Кругликова назвала сбор с заготовителей дикорастущей продукции и доходы от развития агроэкотуризма. Также органу государственного управления может быть оказана безвозмездная спонсорская помощь как юридическим, так и физическим лицом.

— Этого доходного источника в вашем бюджете пока нет, — заметила финансист. — Хотя как органы власти вы имеете право на спонсорскую помощь. Это предложение также будет рассмотрено в ближайшее время.

Кроме того, сегодня в стадии разработки находится Бюджетный кодекс — важнейший документ, который на долговременной основе закрепит за соответствующими уровнями Советов доходные источники и расходные полномочия.

Вопросы, которые в ходе работы «круглого стола» задавали Зое Кругликовой участники встречи, достаточно четко отразили спектр проблем, касающийся реализации на местах Указа № 21.

**Виталий ГОЛОВАЧ, председатель Олекшицкого сельского Совета депутатов Берестовицкого района:**

*— В этом году мы планировали установку железобетонного забора для ограждения улицы, но в райфинотделе сказали, что мы можем установить только деревянный забор. Какой в этом смысл, если он простоит от силы год-два?*

— Вам просто не пояснили, что установка железобетонного забора относится уже к капитальным затратам. А такая статья, как благоустройство, предусматривает только текущие расходы: ремонт заборов, покраску, установку деревянных заборов и т.д. Но если есть необходимость, вы вправе поставить перед вышестоящими властями вопрос о выделении средств на эти цели из районного бюджета.

**Владимир СТАНКЕВИЧ, председатель Полочанского сельского Совета депутатов Молодечненского района:**

*— Мы хотим поставить ограждение на кладбище — длина его по периметру равняется 600 метрам. Составили список граждан, чьи родственники там похоронены, и посчитали, что каждому нужно сдать по 50 тысяч рублей. Потом я обратился за помощью к районным властям, и нам пообещали выделить еще 5 миллионов. Если денег все же не хватит, чтобы в этом году оградить кладбище полностью, хотя бы 400 метров забора поставим.*

— Вы поступаете правильно. Может быть, не сразу, не в один год все получится. Но я хочу обратить ваше внимание на то, что вы должны очень четко проработать с населением вопрос добровольных взносов на это мероприятие. Потому что любой дедушка может пожаловаться: мне сказали внести 50 тысяч! Правомерно это с вашей стороны? Ответ будет один: неправомерно. Смотрите, чтобы добровольные пожертвования не носили у вас характера поборов, чтобы нигде не оговаривалась конкретная сумма: «по 50 тысяч».

*(Окончание на 2-й стар. «МС».)*

# АКНО СУВЯЗІ

**У беларускай Інтэрнэт-прасторы пачаў дзейнічаць веб-рэсурс, галоўная мэта якога — садзейнічанне дэбюракратызацыі органаў улады, у тым ліку і мясцовай. Сайт http://www.ncpi.gov.by/ncla/debur/ створаны ў рамках спецыяльнага праекта прадстаўніцтва ААН у Беларусі па ўдасканаленні і спрашчэнні адміністрацыйных працэдур у краіне.**

На сайце размешчаны беларускія і замежныя прававыя акты і матэрыялы даследаванняў на гэту тэму. Таксама кожнаму ахвотніку рэсурс дае магчымасць паўдзельнічаць ва ўдасканаленні беларускага заканадаўства па адміністрацыйных працэдурах. Для гэтага створана акно сувязі. З яго дапамогай цяпер можна выкласці свае прапановы наконт якасці існуючых законаў, ідэі па іх мадэрнізацыі. Мяркуецца, што такі абмен думкамі насельніцтва з распрацоўшчыкамі законапраектаў пойдзе толькі на карысць заканатворчаму працэсу. Увогуле, у будучым гэта можа стаць вельмі прагрэсіўным і эфектыўным спосабам узаемадзеяння мясцовай улады з насельніцтвам, прадстаўнікамі малога бізнэсу, усіх тых, хто пастаянна сутыкаецца з неабходнасцю выконваць тыя ці іншыя адміністрацыйныя працэдуры. Так што ваша меркаванне будзе да месца.

Нагадаем, гэты двухгадовы праект пачаўся яшчэ летась, яго выканаўчым агенцтвам з'яўляецца Нацыянальны цэнтр законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

МАЛЫЯ ГАРАДЫ

# ВЕЦЕР ПЕРАМЕН

***Паставы ўваходзяць у спіс населеных пунктаў нашай краіны, дзе ажыццяўляецца комплексная дзяржаўная праграма па адраджэнні малых гарадоў і пасёлкаў. Гэты прыгожы горад, якому налета споўніцца 600 гадоў, знаходзіцца літаральна на мяжы з Еўрасаюзам. Паставы, дзе жывуць каля 19,8 тысячы чалавек, такім чынам, з'яўляюцца нашымі «дзвярыма» ў аб'яднаную Еўропу. І горад адпавядае гэтаму сімвалічнаму статусу: выглядае дастойна, на еўрапейскім узроўні.***

***Якія перамены ў Паставах адбыліся ў сувязі з рэалізацыяй адпаведнай праграмы? На гэта і іншыя пытанні адказаў старшыня раённага Савета дэпутатаў Віктар АРЭХАЎ.***

***— Яшчэ некалькі гадоў таму Паставы былі ў ліку гарадоў з вялікім узроўнем беспрацоўя. Цяпер, вядома, гэты паказчык значна паменшыўся. Наколькі?***

— У разы. Калі мець на ўвазе адносіны да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва, у саміх Паставах узровень беспрацоўя сёння складае 3,2 працэнта. А ў цэлым па раёне — 2,6 працэнта. Для параўнання — у сярэдзіне 1990-х паказчык узроўню беспрацоўя ў раёне дасягаў 16 працэнтаў.

***— Падчас рэспубліканскага семінару кіруючых работнікаў, калі абмяркоўвалася тэма адраджэння малых гарадоў і пасёлкаў, Прэзідэнт падкрэсліў, што трэба стымуляваць развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы. Можаце прывесці прыклады паспяховай работы ў Паставах недзяржаўнага сектара эканомікі? Якую дапамогу ад мясцовых уладаў атрымліваюць дзелавыя людзі?***

— Мясцовы бізнэс папаўняе бюджэт раёна ў цэлым прыблізна на 15 працэнтаў. Згодны, што неабходна значна павялічыць гэты паказчык. Таму дапамога прадстаўнікам бізнэсу — на асобным кантролі як у райвыканкаме, так і райсавеце. У нас цяпер зарэгістраваны 72 камерцыйныя структуры — юрыдычныя асобы.

Мы, пастаўчане, можам ганарыцца тым, што ў нас паспяхова дзейнічае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Пастаўскі мэблевы цэнтр», што можна аднесці да «сярэдняга бізнэсу». Нагадаю, у свой час афіцэры пасля завяршэння службы ў арміі арганізавалі маленькую вытворчасць. Бізнэс у іх пайшоў добра. І ў выніку цяпер далёка за межамі Пастаў вядома высакаякасная прадукцыя: дзверы і вокны экспартуюцца ў многія краіны. Тут былі створаны сотні рабочых месцаў. А ў сувязі з пашырэннем вытворчасці іх будзе яшчэ больш — плюс 200. Прадпрыемства працуе прыбыткова. Частка прыбытку накіроўваецца на будаўніцтва фізкультурна-спартыўнай базы. Зрабілі некалькі футбольных палёў з сучасным пакрыццём. Мясцовыя хлопчыкі з задавальненнем займаюцца ў футбольнай секцыі, паспяхова ўдзельнічаюць у чэмпіянаце «Скураны мяч». Дарослая каманда паставіла сабе вялікую задачу — гуляць у вышэйшай лізе. Кіраўнікі прадпрыемства шчыра дапамагалі ў правядзенні капітальнага рамонту дзіцячага аддзялення мясцовай бальніцы. Акрамя ўсяго гэтага, задумалі пабудаваць гатэль.

Можна прывесці шмат прыкладаў, калі ўлады і бізнэс разам вырашаюць самыя розныя праблемы, што перашкаджаюць развіццю дзелавой ініцыятывы. На аўкцыёнах прадаецца зямля, на якой знаходзяцца будынкі з вялікім зносам. Так, фірма «Стыльны дом» набыла зямлю для стварэння вытворчасці блокаў з пенапласту для будаўніцтва дамоў.

Другая фірма купіла ферму для вырошчвання буйной рагатай жывёлы. Акрамя вырабу малочнай прадукцыі, тут плануецца вакуумная ўтылізацыя гною. Вывучаецца пытанне аб перадачы аб'ектаў былога «Ваенсэрвісу» фірме, што хоча займацца здабычай сапрапелю і лячэбных гразяў.

Што датычыцца індывідуальных прадпрымальнікаў, у Пастаўскім раёне іх было зарэгістравана больш за 1000. 70 працэнтаў — у Паставах. На сёння гэты паказчык не вельмі змяніўся. Нехта пачаў сваю справу, нехта больш не пажадаў займацца бізнэсам. І, думаю, што гэта нармальны працэс. У непрадказальных рынкавых умовах выжываюць мацнейшыя. Такое назіраецца ва ўсім цывілізаваным свеце.

***— Ці ўпэўнена сябе зараз адчувае раней вельмі праблемнае прадпрыемства — завод «Беліт»?***

— «Беліт» увайшоў у склад свабоднай эканамічнай зоны. І гэта дае яму нядрэнныя шанцы для развіцця. Нагадаю, што ўпершыню ў Беларусі некалькі гадоў таму тут пачалі ажыццяўляць зборку ЗВЧ-печаў. Аб'ёмы выпуску бытавой тэхнікі будуць павялічвацца. Разглядаюцца пытанні супрацоўніцтва з замежнымі кампаніямі. Летам мінулага года падпісаны кантракт з французскай фірмай па вырабе кабельнай прадукцыі.

***— А як ідуць справы на іншых дзяржаўных прадпрыемствах?***

— На пастаўскім малаказаводзе летась пачалі рэалізоўваць праграму па рэканструкцыі цэха натуральнамалочнай прадукцыі. Гэта прадпрыемства, адно з нямногіх на Віцебшчыне, стала ўладальнікам прэміі Савета Міністраў за дасягненні ў галіне якасці і атрымала гран-пры рэспубліканскага таварыства спажыўцоў за стабільную якасць прадукцыі.

На хлебазаводзе мадэрнізаваны ўвесь тэхналагічны працэс па выпечцы хлебабулачных вырабаў. Тут выкарыстоўваецца сучаснае абсталяванне ад еўрапейскіх вытворцаў.

***— Дзякуючы таму, што ў 2004 годзе ў раён правялі прыродны газ, напэўна, больш актыўна пачало вырашацца пытанне будаўніцтва жылля для гараджан? Як рамантуюцца будынкі грамадскага прызначэння і жылыя дамы?***

— Толькі за апошнія тры гады ў Пастаўскім раёне ў цэлым пабудаваны болей за 500 кватэр і дамоў. Летась у Паставах узвялі 50-кватэрны жылы дом. Цяпер у райцэнтры пачалося будаўніцтва 60-кватэрнага...

1 верасня 2006 года ў горадзе на базе звычайнага інтэрната адкрылася гімназія інтэрнацкага тыпу. Многія аб'екты грамадскага прызначэння былі капітальна адрамантаваныя. У прыватнасці, цяпер у нас вельмі добры і ўтульны раённы Дом культуры, атрымалі другое жыццё будынкі райсуда, вузла электрасувязі. Узведзены новы будынак участка энергазбыту. Завяршаецца рамонт гарадскога ЗАГСА.

Усе дамы ў цэнтры атрымалі новае аблічча, але не забываем і пра іншыя. Капітальны рамонт жылля праводзім пастаянна. У нас вялікі жыллёвы фонд, у тым ліку і той, што застаўся ад былых ваенных гарадкоў.

***— Віктар Пятровіч, днямі ў Паставах пачынаецца семінар для кіраўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Што пакажаце яго ўдзельнікам? У тым, што Паставы сталі ўнікальным турыстычным брэндам, добра вядомым не толькі ў Беларусі і суседніх краінах, безумоўна, ёсць і заслуга прадстаўнікоў СМІ?***

— Мы заўсёды рады гасцям. Сотні журналістаў асвятлялі падзеі падчас Дня беларускага пісьменства, што ў 2006 годзе прайшоў у Паставах. І людзі, якія даўно не былі ў нашым горадзе, выказвалі шчырыя словы пра тое, што Паставы не пазнаць. Бясспрэчна, СМІ вельмі дапамаглі нам. Можна сказаць, што разам быў створаны непаўторны турыстычны «брэнд».

І ў выніку штогод усё больш людзей прыязджаюць, каб пагуляць па старых Паставах, убачыць ферму, дзе разводзяць страўсаў, наведаць вёску Парыж і іншыя цікавыя месцы...

Плануем паказаць удзельнікам семінару і прадпрыемствы, пра якія мы ўзгадвалі ў нашай размове, і страўсаў. А таксама палац Тызенгаўзаў, дзе месціцца раённая бальніца, «Стары млын», музеі, гарадскі парк...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НА ПАРАДКУ ДНЯ — ПАРАДАК

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

**Дэпутат Мінскага раённага Савета Пётр ШАГАЎ:**

— На землях сельсавета-спадарчага прадпрыемства «Усход», якое я ўзначальваю, месціцца 17 населеных пунктаў. Найбольш праблемны — пасёлак Самахвалавічы, дзе даўно ўшчыльную неабходна заняцца добраўпарадкаваннем: агароджы ўстанаўліваць, асфальт класці, рабіць пешаходныя дарожкі і г.д. У Самахвалавічах шмат праблем і са звалкамі. Людзі начамі вывозяць смецце на палі, дзе пасеяна пшаніца. Мясцовая служба ЖКГ працуе нездавальняюча. Будзем імкнуцца вырашыць праблему разам са старшынёй пасялковага выканкама. Адзначу, што ў 2009-м гэты пасёлак павінен стаць аграгарадком.

**Святлана ГЕРАСІМОВІЧ:**

— Я была ў Самахвалавічах і, шчыра кажучы, жахнулася. Асабліва мяне «ўразіў» раён новай жылой забудовы. Чаго толькі не раскідана вакол узводзімых дамоў! Ні намёку на парадак.

**Алена МЕЛЯШКЕВІЧ:**

— Нам не трэба сёння спадзявацца, што нехта дасць сродкі для вырашэння нашых праблем, у тым ліку і на добраўпарадкаванне. Указ № 667 акрэсліў магчымасць зарабляць самастойна — прадаваць зямлю праз аўкцыён. Для Мінскага раёна гэта рэальны шанц, які неабходна выкарыстаць. Што датычыцца Самахвалавічаў, там падрыхтаваны дакументы на выстаўленне на аўкцыён трох участкаў. А грошы, згодна з Указам, пойдуць на развіццё інфраструктуры населенага пункта.

Сапраўды, сёння адно з самых балючых пытанняў у Мінскім раёне — добраўпарадкаванне масіваў новабудоўляў. Для яго вырашэння мы павінны цесна ўзаемадзейнічаць з санітарнай і архітэктурнай службамі, дайсці да кожнага домаўладальніка. Аднак я хачу звярнуць увагу на такі момант. У раёнах новай забудовы вельмі дрэнныя дарогі, але пакуль што там няма ніякіх камунікацый. Ці ёсць сэнс сёння ўкладаць у гэтыя дарогі грошы, калі потым праз іх будуць падводзіцца вада, газ і г.д.? Мы павінны жыць рацыянальна, сродкі расходаваць эканомна.

**Дэпутат Мінскага раённага Савета Галіна ХАРЫТОНАВА:**

— У пытаннях добраўпарадкавання ўлада і насельніцтва пакуль знаходзяцца па розных баках барыкады. І гэта не таму, што ўлада дрэнна спраўляецца. Блізкасць Мінскага раёна да сталіцы накладае пэўны адбітак на свядомасць нашых жыхароў. Яны, як правіла, працуюць у Мінску, а да нас вяртаюцца пераначаваць, скарыстацца сацыяльнымі дабротамі і — выказаць шэраг нараканняў мясцовай уладзе, маўляў, «у сталіцы інакш!» Нам цяжэй, чым іншым, але мы павінны зрабіць усё, каб павысіць статус улады. Гэта з аднаго боку. А з другога — кардынальна змяніць патрабаванні да насельніцтва. Мы сёння так баімся, каб не «выскачыла» нейкая чарговая праблема, што імкнёмся нават лішні раз і не «чапаць» жыхароў. Аднак нават у Канстытуцыі прапісана, што кожны чалавек мае не толькі правы, але і АБАВЯЗКІ! Сёння трэба гаварыць пра тое, што кожны грамадзянін абавязаны трымаць у чысціні тую тэрыторыю, дзе ён жыве. Я хачу ўнесці прапанову. Некалі на сесіі мы зацвярджалі правілы добраўпарадкавання тэрыторыі раёна. Іх ніхто не адмяняў, аднак, лічу, наспела неабходнасць унесці туды пэўныя карэктывы. Сёння ў Мінскім раёне з'явілася вельмі шмат камерцыйных структур, якія не заўсёды разумеюць неабходнасць добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі. Неабходна дакладна прапісаць, што кожны жыхар і суб'ект гаспадарання абавязаны заключаць дагавор на вываз смецця. І даручыць экалагічнай службе сачыць за выкананнем гэтых дагавораў.

**Алена МЕЛЯШКЕВІЧ:**

— У раёне 365 садаводчых таварыстваў. Пакуль усе яны не заключаць дагавор на вываз смецця, навесці парадак не атрымаецца.

**Стараста вёскі Гарадзішча Каладзішчанскага сельсавета Міхаіл ВЯРЦЕЙКА:**

— Вельмі слушная прапанова: няхай за вываз смецця плацяць усе. Аднак у нас пакуль як? Памер аплаты залежыць ад колькасці прапісаных. А я мяркую, што лепш было б устанавіць адзіную суму, якую браць з кожнага дома. І наконт будаўнічага смецця. Ніхто з жыхароў дагавор на яго вываз падпісваць не хоча, але можна зрабіць проста. Калі сельвыканкам выдае дазвол на будаўніцтва — хай тут жа прапануе грамадзяніну падпісаць і дагавор на вываз смецця.

**Старшыня Пятрышкаўскага сельскага Савета Аляксандр МЯКІННІК:**

— Мы на сесіі прынялі рашэнне: усе (ад першай хаты да апошняй) павінны плаціць за вываз смецця. Цяпер у нас на гэта раз у год з кожнага дома спаганяецца 17 500 рублёў. Плацяць усе. Іншага выйсця няма. А праблема ў нас ёсць. Дачнікі. На тэрыторыі Пятрышкаўскага і Лашанскага сельсаветаў 78 садаводчых таварыстваў. Панядзелак-аўторак нашы дворнікі не вуліцы падмятаюць, а прыбіраюць абочыны дарог ля дач, бо дачнікі не хочуць заключаць дагаворы на вываз смецця. Старшыні садаводчых таварыстваў тлумачаць: мы вывозім смецце ў горад. Насамрэч, калі таварыствам выдзялялася зямля, там прадугледжваліся пляцоўкі, дзе павінны стаяць кантэйнеры. Але яны кантэйнеры ўбралі, зямлю аддалі пад будаўніцтва. Неабходна прымусіць дачнікаў заключыць дагавор на вываз цвёрдых бытавых адходаў. Яшчэ адзін балючы момант — чыгунка. Яна праходзіць праз тэрыторыю ўсяго Мінскага раёна. Сёння страшна глядзець на паласу адводу. І гэта смецце не нашы людзі носяць, яго выкідваюць з пасажырскіх цягнікоў.

**Святлана ГЕРАСІМОВІЧ:**

— Гэта наша агульная праблема. Мы будзем размаўляць з начальнікам Беларускай чыгункі. Паслухаем яго справаздачу на абласной сесіі. Неабходна прымаць меры.

**Дэпутат Бараўлянскага сельскага Савета, старэйшына вёскі Слабодчына Вольга МЕТА:**

— Калі гаварыць пра добраўпарадкаванне, у нашай вёсцы раней дровы, цэглу, іншы будаўнічы матэрыял, які не спатрэбіўся, складзіравалі проста ўздоўж дарогі, ля хат. Я не вытрымала, пайшла з блакнотам па дварах, устанаўлівала тэрмін, да якога трэба было ўсё ўбраць. Наслухалася рознага. Затое сёння ў вёсцы чыста, кветнікі не толькі ў дварах, але і на вуліцах. Людзі ведаюць: прывезлі дровы — за тры дні іх трэба ўбраць. І самі прыходзяць да мяне з інфармацыяй, калі ў некага з суседзяў дровы ляжаць непрыбранымі.

**Старэйшына вёскі Шчытомірычы Сеніцкага сельсавета Фёдар ЦЯЛЮК:**

— У мяне працягласць вёскі — 4 км. І на гэтым адрэзку гараць усяго тры лямпачкі. Колькі я ні тэлефанаваў, колькі ні біўся... Там жа дзеці ходзяць, а вечарам цёмна. Ёсць вуліца Школьная — 800 м. Там вулічнага асвятлення ўвогуле няма. Не прадугледжана. А некалькі гадоў таму там пад коламі аўтамабіля загінула дзяўчынка.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Фёдар СТРЫКАЎ:**

— Сённяшні Дзень дэпутата даў нам цудоўную магчымасць сустрэцца з дэпутатамі ўсіх узроўняў, абмяняцца вопытам, абмеркаваць праблемныя пытанні. Хто такі дэпутат? Гэта сур'ёзны, ініцыятыўны чалавек, які ўзяў на сябе пэўныя абавязкі і пры падтрымцы мясцовых улад імкнецца забяспечыць ім камфортнае пражыванне. Вы ўплываеце на свядомасць людзей на сваім узроўні — сельскага Савета, раённага, абласнога. І пра гэта заўсёды неабходна памятаць.

**Запісала Інга МІНДАЛЁВА.**
*г. Заслаўе.*

> **— У пытаннях добраўпарадкавання ўлада і насельніцтва пакуль знаходзяцца па розных баках барыкады.**

# ЧАМУ АДХОДЫ НЕ ІДУЦЬ У ДАХОДЫ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Ні першае, ні другое, ні трэцяе Каладзішчанскі КУП дазволіць сабе не можа. У сярэднім за месяц ён вывозіць каля 1300 кубаметраў смецця. На вываз кожнага кубаметра адходаў рэальна затрачваецца 14 тысяч рублёў. А вяртаецца ў «кішэню» толькі 4 тысячы. Інакш кажучы, КУП працуе са стратамі там, дзе пры наяўнасці адпаведнага заканадаўчага акта (аб абавязковым заключэнні дагавораў) мог бы мець прыбыткі.

— Як вы думаеце, колькі дагавораў на вываз смецця заключае жыллёва-камунальная гаспадарка сталіцы? — пытаецца Сяргей Жолуд. — Ніводнага. Таму што ім гэта непатрэбна: ёсць жорсткія заканадаўчыя нормы, у адпаведнасці з якімі бярэцца плата «за смецце», у гарадах гэта сістэма адладжана добра. Акрамя таго, дзяржава выдзяляе для ЖКГ датацыі — і на вываз смецця, і на ваду, і на іншыя бытавыя паслугі. У сельскай мясцовасці датацыі на вываз смецця не запланаваны. Таму мне, каб пакрыць расходы, трэба павялічваць колькасць дагавораў, але зрабіць гэта на сваім узроўні мы не можам. Таму сродкі на пакрыццё нашых затрат бяруцца з тых, што выдзяляюцца сельсавету на добраўпарадкаванне. Інакш кажучы, замест таго, каб зрабіць дарогу ці агароджу, сельвыканкам вымушаны датаваць вываз смецця...

Сёння КУП «Экскампаслуга» аддуваецца, акрамя ўсяго іншага, і за тэрыторыі 273 прадпрыемстваў, размешчаных на землях Каладзішчанскага сельсавета. Кіраўнікі кожнага з іх ведаюць, што паводле нарматываў павінны падтрымліваць парадак не толькі ўнутры будынкаў, але і звонку. Прычым на тэрыторыі радыусам да 55 метраў. Але...

— Ніхто нічога падобнага не робіць, — з веданнем справы канстатуе Сяргей Жолуд. — Прадпрыемствы мала падкантрольныя або ўвогуле непадкантрольныя мясцовай уладзе. Большасць іх зарэгістравана ў сталіцы. Старшыня сельвыканкама можа выдаваць ім нейкія прадпісанні — але вынік будзе нулявым. Яму прасцей патэлефанаваць дырэктару КУПа, інакш кажучы, мне, і папрасіць: «Слухай, з'ездзі туды і прыбяры. І вялікі табе дзякуй за гэта!» Правільна гэта? Няправільна. Нехта павінен кантраляваць парадак на тэрыторыях прадпрыемстваў, правяраць, ці заключылі яны дагаворы на вываз адходаў... Перыядычна гэтым займаюцца санстанцыя ці экалогія. Але прадпісанні выпісваюць не вінаватаму, а... старшыні сельвыканкама. Я, напрыклад, ведаю, хто і колькі адходаў вывозіць і скідвае ў непрызначаныя для гэтага месцы. Падыходжу да кіраўніка прадпрыемства, прапаноўваю заключыць дагавор на цывілізаваны вываз. А ў адказ чую: «А ці не пайшоў бы ты...»

У выніку палова работы КУПа застаецца нябачнай нікому, бо зводзіцца да прыбірання чужых «аўгіевых канюшняў» і ніякага прыбытку не прыносіць.

Дарэчы, зарплата работнікаў унітарнага прадпрыемства вагаецца ў межах 400—500 тысяч. І тым не менш, Сяргей Васільевіч не разменьваецца на «кадры», ад якіх у 11 гадзін раніцы патыхае спіртным — развітваецца з такімі без шкадавання. Затое пра тых, хто застаўся, гаворыць з вялікай удзячнасцю і павагай. Практычна кожны з іх (як і сам дырэктар) не цураецца ніякай работы.

— Раніцай мае людзі хутка праходзяць па тэрыторыі і прыбіраюць смецце ў пакеты — потым прыязджае трактар і забірае сабранае. Летам мы робім гэта праз дзень, зімой — праз 2—3 дні. Кожны дзень нельга — тэхніка ад перагрузкі развальваецца. У нас ёсць прычэп 2005 года — цэлым ад яго застаўся толькі нумарны знак.

Тэхніка — яшчэ адно праблемнае пытанне для КУПа. Двум трактарам па 4 гады. Яны пастаянна рамантуюцца, так што ў рабочым стане знаходзіцца нейкі адзін. Але чалавеку, калі ўжо ён выклаў 7 тысяч за заключэнне гадавога дагавора, па вялікім рахунку пляваць, што яго старая канапа ці пральная машына з паняццем «смецце» не стасуюцца і ў кузаў не ўмяшчаюцца. У выніку вадзіцель, каб не псаваць сабе нервы, займаецца яшчэ і пагрузкай буйнагабарытных рэчаў.

— Самае разумнае ў гэтай сітуацыі — выдзеліць нам смеццявоз, які прэсуе смецце больш эфектыўна. А галоўнае — у гэтай машыны будзе невялікі люк, куды нельга запіхнуць, скажам, спілаванае садовае дрэва ці сапсаваную газавую пліту... Нашу просьбу ўжо разглядалі ў аблвыканкаме, паабяцалі падтрымаць нас з тэхнікай. Вось чакаем...

...У невялікім кабінеце дырэктара КУПа, дзе мы размаўляем, прыстойная офісная мэбля (для сельскага прадпрыемства — аж занадта). Перахапіўшы мой зацікаўлены позірк, Сяргей Васільевіч тлумачыць: усё зроблена і сабрана яго рукамі з падручных матэрыялаў. Затраты — мізэрныя.

— Падобныя паслугі мы маглі б аказваць і насельніцтву — тым больш што з рамонтам мэблі ў сельскай мясцовасці адчуваецца напружанне. Акрамя таго, маглі б займацца, скажам, некаторымі рытуальнымі паслугамі — на сёння гэта вялікая праблема для сельсавета. Словам, задумак, як зарабіць грошы, шмат. Але... Я не магу скласці бізнэс-план, бо не ведаю, ці здолею яго выканаць. Усё ж у першую чаргу мы падпарадкоўваемся сельвыканкаму, бо з'яўляемся дзяржаўнай гасразліковай структурай. Я не магу, напрыклад, паабяцаць людзям зрабіць дзверы пад заказ, таму што заўтра мяне, умоўна кажучы, «кінуць» на абкос тэрыторыі дзіцячага садка. І такіх тэрыторый у сельсавеце — процьма, аплата за работу мінімальная... Можна, безумоўна, і без грошай працаваць. Скажам, паўгода. Але пры ўмове, што цярпіш дзеля пэўнай перспектывы.

На сённяшні дзень я і сам не магу зразумець, на «якім свеце» знаходзіцца наш КУП. Калі гэта дзяржаўная камунальная структура, яна павінна існаваць па аднолькавых законах з гарадскімі камунальнымі службамі і мець адпаведную тэхніку. У адваротным выпадку нам лепш перайсці на аказанне насельніцтву шырокага спектра платных паслуг.

**Наталля КАРПЕНКА,**
*Мінскі раён.*

# ПРЭМІІ ЛЕПШЫМ

**У Віцебскай вобласці падведзены вынікі традыцыйнага конкурсу сярод органаў мясцовага кіравання і самакіравання.**

Упершыню пераможцы атрымаюць не прызы, а грашовыя прэміі, а ўжо на месцах кіраўнікі самі разбяруцца, куды накіраваць атрыманыя прэміяльныя.

У намінацыі «Лепшы сельскі, пасялковы Савет дэпутатаў» (з колькасцю насельніцтва звыш 2400 чалавек) пераможцам прызнаны Стайскі сельскі Савет дэпутатаў Лепельскага раёна. Валынецкі сельскі Савет дэпутатаў Верхнядзвінскага раёна перамог у спаборніцтве сярод Саветаў, на тэрыторыі якіх жывуць ад 1,5 да 2,4 тысячы чалавек. А ў так званай «трэцяй групе» (дзе пражываюць да 1,5 тысячы грамадзян) першае месца дасталася Туркоўскаму сельскаму Савету дэпутатаў Міёрскага раёна.

У намінацыі «Лепшы сельскі, пасялковы камітэт» першае месца — у сельскага камітэта вёскі Тарасенкі Запольскага сельсавета Віцебскага раёна.

У спісе лепшых вельмі шмат старэйшын. У іх ліку Уладзімір Анякеенка з вёскі Галоўчыцы Расонскага раёна, Мікалай Астрашаб з вёскі Заронава Віцебскага раёна, Надзея Васілёнак — з вёскі Багданава Сенненскага раёна і іншыя.

Як нагадаў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Ацясаў, толькі другі год дзейнічае знакавы для органаў мясцовага самакіравання Указ № 21, а ў выніку даходныя часткі бюджэтаў сельскіх Саветаў вобласці прыкладна на 70 працэнтаў сфарміраваны за кошт уласных крыніц. Упершыню ў бюджэтах пярвічнага звяна ўлады з'явіўся такі расходны артыкул, як кампенсацыя выдаткаў на аказанне жыллёва-камунальных паслуг прадпрыемстваў. Больш стала сродкаў і на добраўпарадкаванне.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Андрэйчанка ў ліку іншага падкрэсліў, што вялікую ролю адыгрываюць Саветы ў рэалізацыі праграмы развіцця малых гарадоў і пасёлкаў. У 2007-м у гэтых населеных пунктах створана больш за 4 тысячы новых рабочых месцаў, зніжаны ўзровень беспрацоўя. У эканоміку малых гарадоў і пасёлкаў прыцягнута больш за 300 мільярдаў рублёў інвестыцый. Задача на гэты год — прыцягнуць 400 мільярдаў інвестыцый і стварыць яшчэ мінімум 3,4 тысячы рабочых месцаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НАВАЛА ДЛЯ КАМУНАЛЬНІКАЎ

## У Брэсце змагаюцца з тымі, хто пэцкае будынкі



Фота БЕЛТА.

**У пагранічным Брэсце апошнім часам вядуцца вялікія работы па добраўпарадкаванні горада. Цэнтральная яго частка літаральна за апошні год змянілася, памаладзела, многія вуліцы набываюць сучасны і стыльны выгляд. Асаблівым гонарам брастаўчан становіцца пешаходная вуліца Савецкая — гэткі мясцовы Арбат. Тут рэстаўравана шмат старых пабудоў, узводзяцца новыя. На адным з фасадаў аднаўленых дамоў летась быў устаноўлены помнік мясцоваму самакіраванню. І вось пад гэтай мемарыяльнай дошкай, якая адлюстроўвае грамату на дараванне гораду магдэбурскага права, юныя пэцкалі панамалёўвалі розных знакаў. Адбылося гэта ў адну з лютаўскіх начэй. Ранкам прыйшлі на працу камунальнікі, будаўнікі і літаральна за галовы ўзяліся: некалькі фасадаў свежапафарбаваных будынкаў былі замаляваны ўшчэнт.**

Праз колькі дзён старшыня гарадскога Савета Генадзь Масько і старшыня гарвыканкама Аляксандр Палышэнкаў сабралі тэрміновую нараду. На парадку дня стаяла адно пытанне: як пераадолець хваробу маладзёжнага асяродку? На сход былі запрошаны педагогі, работнікі ЖКГ, міліцыі, гандлю, транспарту, прадстаўнікі маладзёжных арганізацый. Праваахоўнікі расказалі, што ў горадзе дзейнічаюць некалькі груповак графітыстаў, якія спаборнічаюць адна з адной, хто запырскае фарбай больш сцен і ўцячэ ад пакарання. Дзеткі «гуляюць», а ўрон падлічваюць мільёнамі ўстановы камунальнай гаспадаркі.

Адзін з удзельнікаў нефармальнага гуртка графітыстаў, які быў запрошаны на нараду, расказаў пра кодэкс гонару сапраўдных «прыхільнікаў жанру». Аказваецца, ёсць і такі. Няпісаныя правілы забараняюць паліваць фарбай помнікі, аўтамабілі і новыя будынкі. І кодэкса прытрымліваюцца «райтэры», якія працуюць на заказ, удзельнічаюць у спаборніцтвах, працуюць, можна сказаць, прафесійна. А групоўка, якую называюць бомберы, «бамбіць» усё, што пад руку трапіцца.

Дарослыя ўдзельнікі пашыранай нарады схіляліся да думкі, што найбольш дзейснай мерай барацьбы з несанкцыянаваным графітызмам з'яўляецца выяўленне парушальнікаў і ўнушальныя штрафы. Тэлефонны тэрарызм у горадзе знік пасля таго, як бацькі школьных «мінёраў» заплацілі больш чым па дзесяць мільёнаў рублёў. У такую суму былі ацэнены выдаткі МНС, міліцыі і іншых сілавых структураў, якія правяралі сігналы. Іншая справа, што злавіць хулігана-малявальшчыка значна цяжэй, чым тэлефоннага жартаўніка.

Дарэчы, адзін з аматараў насценнага роспісу нядаўна затрыманы і накіраваны ў следчы ізалятар. Цяпер высвятляецца кола таварышаў 20-гадовага непрацуючага брастаўчаніна. Так што забавы дзеля выкіду адрэналіну, як самі нярэдка вызначаюць сваё «мастацтва» графітысты, маюць канкрэтныя вызначэнні ў адпаведных артыкулах у Адміністрацыйным і Крымінальным кодэксах. Надпісы на сценах могуць абярнуцца штрафам да 50 базавых велічынь (1,75 мільёна рублёў). А калі нанесены ўрон акажацца значным, можа быць узбуджана крымінальная справа паводле артыкула 341, які прадугледжвае пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ або арышт на тэрмін да трох месяцаў.

Але каб было з каго спагнаць грошы на аднаўленне пашкоджаных фасадаў, трэба зламысніка злавіць, даставіць яго ў аддзяленне міліцыі, афармiць неабходныя дакументы. Таму жыллёва-рамонтна-эксплуатацыйнае ўпраўленне Брэста пайшло на меры беспрэцэдэнтныя. Як сказаў карэспандэнту газеты дырэктар ЖРЭУ Павел Заграй, у іх арганізацыі прадугледжаны прэміі работнікам, якія затрымаюць графітыстаў. Дворнікі, прыбіральшчыцы і іншыя супрацоўнікі, якія зловяць парушальніка, атрымаюць прэмію ў памеры 10 базавых велічынь — гэта крыху больш за 300 тысяч рублёў. Павел Пятровіч патлумачыў, што на такія меры іх прымусіла пайсці само жыццё. Урон, які панесла арганізацыя па адной толькі вуліцы Савецкай, у гэтым годзе ацэньваецца прыкладна ў тры мільёны рублёў. А ў дварах, на вуліцах кожны дзень заняты 600 супрацоўнікаў арганізацыі. Ім трэба праявіць пільнасць у барацьбе з грамадскай заганай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПРЕДПРИЯТИЙ — БОЛЬШЕ, А НАЛОГОВ — МЕНЬШЕ

***(Окончание. Начало на 1-й стр. «МС».)***

Просто на общем собрании граждан обозначьте проблему — поставить забор на кладбище за счет добровольных взносов граждан. Кстати, на эти цели могут быть направлены и средства из резервного фонда (хотя в первую очередь они предназначены для оказания поддержки малоимущим — ремонт печи, установку противопожарной сигнализации и т.п.).

**<u>Петр ВАБИЩЕВИЧ, председатель Янушковичского сельского Совета депутатов Логойского района:</u>**

*— На сегодняшний день все наши кладбища находятся в полуподвешенном состоянии. Чей это объект? Куда мы вкладываем деньги, благоустраивая их? Потому что ни на чьем балансе они не стоят.*

— Кладбище — это такой специфический объект, что, возможно, он не будет находиться ни на чьем балансе. Но однозначно расходы по его благоустройству и содержанию в чистоте в первую очередь должен нести Совет первичного уровня. Если уже вы там что-то серьезное хотите сделать — капличку, например — то такие вопросы могут решаться только при участии вышестоящих органов власти.

**<u>Галина ШРЕДЮК, председатель Паричского поселкового Совета депутатов Светлогорского района:</u>**

*— Каким образом, за счет каких источников будет финансироваться снос пустующих, ветхих домов, а также аварийных деревьев? Найти эти средства на местах очень сложно.*

— Вопрос очень непростой, особенно это касается Гомельской области, где осталось много пустующих домов. Но, тем не менее, пока в бюджетах первичного уровня расходы на снос не предусмотрены. Возможно, что-то изменится в ходе уточнения бюджетов. Но вы вправе обращаться с такими вопросами на вышестоящие уровни, где централизованы денежные средства — в район или область. Кроме того, в этом году будет осуществляться дальнейшее укрепление материально-технической базы Советов — областям на эти цели передано порядка 10 миллиардов рублей. Думаю, деньги можно будет изыскать.

**<u>Тамара ЛЕЙКО, председатель Красненского сельского Совета депутатов Кореличского района:</u>**

*— До 1 июня прошлого года наши сельсоветы уточнились по бюджету и внесли свои предложения. Но 120 миллионов, выделенных нам из района, пошли по целевому назначению на освещение. На благоустройство не дали ни копейки...*

— Но статьи на освещение и благоустройство в бюджете должны быть разграничены! Если у вас в районе не предусмотрели расходы на благоустройство, то это в корне неправильно. Можете смело ставить перед ними этот вопрос. Либо сами принимайте решение об уточнении бюджета и на сессии эти изменения проводите.

**<u>Галина МАЛАХОВСКАЯ, председатель Видзовского сельского Совета депутатов Браславского района:</u>**

*— В бюджет заложена оплата за электроэнергию. А вот расходы за техобслуживание электросетей туда не входят...*

— Да, обслуживание всегда было острым вопросом, за обслуживание платили больше, чем за потребление электроэнергии. Но возьмем в качестве примера Лиозненский район. Что они сделали? Председатель райсовета утвердила следующий график обслуживания есть обслуживание плановое, а есть — по вызову. Если электрики выезжают по вызову, то выставляют сельисполкому счет. В результате никто никаких вызовов практически не делает. Зато по плану два раза в месяц к председателю Совета приезжают работники РЭС и решают проблемы, связанные с обслуживанием бесплатно. Достаточно удачный подход.

**Наталия КАРПЕНКО.**

МЫ ТАМ БЫЛІ

# ФАКТАРЫ РЫЗЫКІ ДЛЯ ДЭПУТАТА

**У Магілёўскім лячэбна-дыягнастычным цэнтры адбыўся Дзень здароўя для дэпутатаў абласнога Савета, старшынь гарадскіх і раённых Саветаў і выканаўчых камітэтаў. Яны прайшлі навучанне на спецыяльным семінары «Роля кіраўнікоў дзяржаўных органаў кіравання і дэпутатаў аблсавета ў фарміраванні здаровага ладу жыцця насельніцтва як асноўнага прыярытэту ў 2008 годзе».**

Семінар пачаўся з дыспансэрызацыі першага ўзроўню, якую сёлета павінна прайсці ўсё насельніцтва краіны. Каля сотні дэпутатаў і кіраўнікоў прайшлі медагляд: зрабілі аналіз крыві і кардыяграму, наведалі кардыёлага і эндакрынолага, іншых спецыялістаў.

Першыя вынікі былі занесены ў спецыяльныя «Пашпарты здароўя». Выявілася, што пераважная большасць удзельнікаў дыспансэрызацыі (прыкладна 90 %) мае тыя ці іншыя фактары рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў: лішнюю вагу, павышаны артэрыяльны ціск і г.д.

Дэпутатам і кіраўнікам таксама прапанавалі ацаніць узровень стрэсу, які яны зведваюць на працы і ў жыцці. Выявілася, што больш за палову з іх маюць сярэдні ўзровень стрэсу, а амаль чвэрць — высокі, што таксама не можа не ўплываць на стан здароўя.

Пасля дыспансэрызацыі — дэгустацыя здаровых прадуктаў, экалагічна чыстых і даступных па цане. Смачныя малочныя вырабы са Шклова, карысныя фітачаі з Мінскай вобласці, мінеральная вада і сокі з агародніны з Магілёўскага раёна, бяздрожджавы хлеб з дабаўкамі цэльнага зерня ад магілёўскіх хлебапёкаў.

Аднак мужчыны, якіх была большасць сярод удзельнікаў семінара, асаблівую ўвагу надавалі вырабам мясакамбінатаў. Хоць, зазначыла ўрач-дыетолаг Святлана Каладзінская, вэнджанасці і каўбасу можна назваць здаровымі прадуктамі толькі з вялікай нацяжкай.

Да століка дыетолага падыходзілі ў асноўным жанчыны. Урач давала рэкамендацыі: больш есці нятлустыя малочныя прадукты, агародніну і садавіну — аб'ём вялікі, а калорый няшмат, меней заглядацца на пірожныя, сала і свіныя адбіўныя. Хоць любая дыета, барацьба за фігуру павінны быць разумнымі: адмова ад ежы недапушчальная. І яшчэ трэба больш рухацца: калі чалавек будзе праходзіць пешшу хоць бы 3 кіламетры штодня, ён без усялякіх абмежаванняў у ежы скіне за месяц 1 кілаграм вагі.

Галоўны Дзяржаўны санітарны ўрач Магілёўскай вобласці Ігар Гаеўскі нагадаў усім прысутным: калі чалавек прытрымліваецца элементарных правілаў — не курыць, не злоўжывае алкаголем, мае ўмераныя фізічныя нагрузкі, штодня з'ядае 400—500 грамаў агародніны і садавіны, то ён пражыве на 14 гадоў больш. Фактычна гэта і называецца здаровым ладам жыцця.

Як стварыць на сваіх тэрыторыях сістэму фарміравання здаровага ладу жыцця, расказаў удзельнікам семінара Валерый Ключановіч, загадчык лабараторыі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены. Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Віктар Шорыкаў выказаў занепакоенасць узроўнем алкагалізацыі: паводле статыстыкі, магіляўчане сёлета сталі піць алкагольных напояў на 15 працэнтаў больш. Ён нават думае над «сухім» законам, але яго калегі лічаць, што дзяржава і грамадства да гэтага не гатовыя.

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Глаз упэўнены, што на месцах можна зрабіць шмат і без дадатковых даследаванняў і вялікіх выдаткаў: напрыклад, забараніць курэнне на прадпрыемствах, увесці вытворчую гімнастыку, заахвочваць работнікаў за цвярозы і здаровы лад жыцця...

Індывідуальнае аздараўленне — важная складовая фарміравання здаровага ладу жыцця. І першы крок на гэтым шляху — якраз дыспансэрызацыя, у чым магілёўскія дэпутаты і кіраўнікі паказваюць прыклад.

— Гэта наша акцыя, прысвечаная здароўю, — пракаментаваў падзею старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Панцюхоў. — Ідэя належала старшыні Пастаяннай камісіі па сацыяльных пытаннях Валерыю Малашку. І я яе падтрымаў ахвотна. Нашы дэпутаты, кіраўнікі — лідары, а лідар павінен быць здаровым і энергічным.

Дарэчы, сам Уладзімір Панцюхоў запэўніў, што прытрымліваецца здаровага ладу жыцця: два разы на тыдзень плавае, раніцай робіць зарадку, не курыць.

**Ілона ІВАНОВА.**

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**

**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»**

**ГРАМАДСКІ САВЕТ:**

**МАЛАФЕЕЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

**САСОНКА М. П.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

**СЯЛІЦКІ В. С.,** старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

**СІВАКОЎ В. А.,** старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

**ЯРКОВІЧ В. І.,** старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

**АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.**

***Кантактны тэлефон 292 21 03.***

